Чытанка-маляванка для дашкольнікаў

# Каласавічок

№ 210

## Трэба ведаць кожнаму правілы дарожныя

Мой маленькі дружа, а ці заўважаў ты калі-небудзь, што нас паўсюль акаляюць знакі: званок у школе дае знак, што пачаўся ўрок ці перапынак, гук будзільніка абвяшчае пра тое, што пара прачынацца, жоўтае лісце на дрэвах – знак восені, а першыя сняжынкі – вестуны зімы…

Самыя ж важныя знакі – дарожныя. Ад іх ведання залежыць жыццё і здароўе пешахода.

Памятай пра гэта, дружа!

### “Пешаходны пераход”

Тут наземны пераход,
Ходзіць цэлы дзень народ.
За рулём не забывай –
Пешахода прапускай!



### “Рух пешаходаў забаронены”

Ведай цвёрда: без нагоды
Тут не ходзяць пешаходы.

### “Рух без прыпынку забаронены”

Ты, кіроўца, не спяшайся,
Каля знака затрымайся!
Скажуць нават малюкі:
Паглядзі ва ўсе бакі.








### “Дзеці”

Май, кіроўца, асцярогу!
Дзеці выйшлі на дарогу.
Значыць, трэба пастаяць,
Каб жыццё ім захаваць.



### “Скрыжаванне з трамвайнай лініяй”

Кажа гэты знак, канечне,
Што хадзіць тут небяспечна.
Прыпыніся, не спяшай!
Бо наперадзе – трамвай.






У паласатую сукенку
Апранулася паненка.
А на выгляд – афрыканка,
Расфарбуйце маляванку.

### Крыжаванка




1. Як называецца затор на дарозе?
2. Паглыбленне ў асфальце.
3. На слупе вісяць тры вокі,
   Іх убачыш ты здалёку.
   На шашы трымаюць варту,
   Не гуляйся з імі ў жарты.
4. Месца для высадкі пасажыраў.
5. Якая “жывёла” дапамагае нам пераходзіць дарогу?
6. Месца, дзе сыходзяцца вуліцы.
7. Не жывая, ды ідзе,
   Нерухомая – вядзе.

*Тэкст Алеся БАРАНОЎСКАГА,*
*малюнкі Уладзіміра ЖУКА.*